STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 11, ROK 2011

*Іна Швед*
*Брэст*

# Міфасемантыка зялёнага колеру ў традыцыйнай духоўнай культуры Палесся

Зялёны колер з'яўляецца адным з вызначальных элементаў колеравага кода традыцыйнай духоўнай культуры Палесся. Разам з шэрагам іншых колераў ён выступае грунтам семантычных апазіцый тыпу "жоўты/зялёны", "белы/чорны", маркёрам класаў ізафункцыянальных аб'ектаў і можа кваліфікавацца як прыкмета, якая з'яўляецца важным інструментам пазнання і катэгарызацыі свету, ідэнтыфікацыі і параўнання яго аб'ектаў. Прадметнае поле колеравай прыкметы "зялёны" ў палескім фальклоры надзвычай шырокае, а яе культурная трактоўка уцягвае ў семантычную сферу адпаведнага колеру шырокі спектр асацыяцый, канатацый, матываў. З вядомай ступенню абстракцыі можна адзначыць, што зялёны, як і іншыя колеры, па-першае, можа функцыянаваць у выглядзе асобнага тыпу колеравага сімвала, па-другое, утвараць колеравае спалучэнне, сэнс якога не зводзіцца да сумы значэнняў асобна ўзятага колеру. Трэці варыянт функцыянавання зялёнага колеру як сімвала – гэта спалучэнне колеру і формы, з чым, дарэчы, звязана вырашальная роля колераў у фарміраванні культурных значэнняў розных прадметаў.

Адзначым, што ў магічных прыёмах колер (у тым ліку зялёны) нярэдка з'яўляецца больш важным чыннікам, чым сам прадмет. Колеры аказваюцца матэрыялам для пабудовы культурных мадэлей з не колеравым зместам, адыгрываюць ролю важных класіфікатараў, выконваюць ацэначную ролю, вызначаюць чалавека ў яго біялагічным, сацыяльным, рытуальным статусах, а ў дэманалогіі з'яўляюцца прыкметамі, на аснове якіх розныя катэгорыі дэманічных персанажаў мож-

на адрозніць ад рэальна існуючых людзей, жывёл ці артэфактаў. Колеравыя характарыстыкі – немалаважны элемент у раскрыцці міфалагічнай сімволікі жывёл, раслін, матэрыяльных прадметаў, а таксама часавых адрэзкаў, якія праз колеравую прыкмету атрымліваюць больш глыбокую і адэкватную інтэрпрэтацыю. Так, вылучаныя ў каляндарна-часавай прасторы т.зв. *зялёныя, чырвоныя і белыя дні (тыдні)*, акцэнтуюць пачатак (ці канец) пэўных перыядаў.

Ёсць падставы лічыць, што семантыка колеравых сімвалаў палескай традыцыйнай культуры захавала шэраг архаічных прыкмет, мае агульнаславянскі характар і даволі шырокія агульнаеўрапейскія паралелі. У гэтым артыкуле прапануюцца некаторыя назіранні над функцыянальнасцю зялёнага колеру як чынніка сімвалічнай сістэмы палескай традыцыйнай культуры. Частка прааналізаванага факталагічнага матэрыялу сабрана на Берасцейшчыне ў апошнія пяць гадоў па праграме, распрацаванай аўтарам артыкула. Выкарыстаны таксама запісы беларускага (шырэй – славянскага) фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу XIX–XX стст. Таму падаецца храналагічна размыты вобраз палескай традыцыі семіятызацыі зялёнага колеру на агульнаславянскім фоне.

* * *

Зялёны колер надзяляецца высокім семіятычным статусам у традыцыйнай карціне свету палешукоў і іншых славян. Прататыповыя носьбіты прыкметавага канцэпту ‘зялёны’ – гэта расліннасць і некаторыя хтанічныя жывёлы, параўнаем: *“Зялёны як жаба”*, *“Зялёны як зяляпуха”*, *“Зялёны як мурава”*, *“Зялёны як рута”*[1]. Зялёным колерам можа маркіравацца нават сонца (яго выпраменьванне). Так, лічылася, што сонца можа “іграць” на Узвіжанне, змяняючы зялёны і чырвоны колеры [ПА[2]; Барбараў Мазырскага р-на Гомельскай вобл.].

Распусканне першай веснавой зеляніны ўспрымалася як падзея, якая адкрывае сезон вегетацыі, як адна з найважнейшых прыкмет надыходу вясны (*“Дабравешчаннiко святое, // Пашлі сонейка залатое, // Каб зямелька адышла // Ды вясна да нас прыйшла, // Каб распусціліся ветачкі, // Каб раскраснеліся кветачкі, // Каб лугі зазеляненеліся”*[3]). Зялёны колер – прыкмета лета, як белы – зімы: *“Ой ты Ку-*

---

[1] *Выслоўі*, скл. М. Я. Грынблат, Мінск 1979, с. 331.

[2] ПА – Палескі архіў Інстытута славяназнаўства РАН (Масква).

[3] *Веснавыя песні*, скл. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, В. І. Ялатаў, Мінск 1979, с. 150.

*пайло, Купайлечко, // Дзе ж ты зімочку зімовало, // Дзе ж ты лецейко летовала? // Я зімовало ў беленьком, // А летовало ў зелёненьком*" [ФЭАБ[4]; Лушчык Е. І. 1941 г.н., Дрэбск Лунінецкага р-на]. Калі лісце на дрэвах з'яўляецца пасля прылёту зязюлі, то, паводле народных прыкмет, гэта вяшчуе бяду. Калі ж зязюля пачынае кукаваць "на зялёны лес", чакаецца ўраджай злакаў. На Магілёўшчыне забаранялася пачынаць спяваць вяснянкі "на голы лес", г. зн. пакуль не разгорнецца лістота на дрэвах. У вяснянках з'яўленне новай зеляніны малюецца як вынік сезоннага "адмыкання зямлі", якая выпускае з сябе *травіцу, расіцу, на лясочак, лісточак*, – да прыкладу: *"Юр'ева маці // Па гары хадзіла, // Ключыкі насіла, // Зямлю адмыкала, // Траву выпускала, // На травіцу – расіцу..."*[5].

Матыў "выхаду з-пад зямлі" вызначае некаторыя хтанічныя прыкметы зеляніны, яе сувязь з іншасветам, продкамі, персанажамі нячыстай сілы. Паказальная ў гэтым плане назва хваробы жывёл "руно", звязаная з дзеясловам *рунець* 'узыходзіць, зелянець (звычайна пра азімыя пасевы)', 'цвісці (пра дрэва)'. Параўнаем: «калі вясной рунела елка і сасна, дабытак западаў на асаблівую хваробу, "руно", ад якой не было ратунку»[6]. Адзначым, што зялёны колер актуалізуецца і пры апісанні ліхаманкі: *"...Перш падышла хондзя, ці як жэ кажуць, трасца, – зялёная, худая..."*[7]. Дарэчы, адным са сродкаў пазбаўлення ад гэтай хваробы лічылася зялёная жаба: *"Ат хинди не лечать, а тольки дають какие жабы зелёные изловят и варят ў суп и дають"*[8]. Зялёныя жывёлы выкарыстоўваліся з магічнымі лекавымі мэтамі і ў іншых выпадках. Так, ад шалу пілі ваду, у якой знаходзіліся "маленькія зялёныя насякомыя", што вывеліся з яек мурашоў[9].

Даволі пашыранымі з'яўляюцца ўяўленні, што такія дэманічныя істоты, як лесавік, русалка, воднік маюць цела (або пэўныя яго часткі) зялёнага колеру. Так, лічылі, што зялёныя валасы ў лесавіка, русалкі, водніка; зялёнага колеру нячысцік; вочы зялёнага колеру маюць русалкі, лесавік, воднік; скура ў русалкі зялёная; барада ў водніка зялёная

---

[4] ФЭАБ – Фальклорна-этнаграфічны архіў вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкина.

[5] *Веснавыя песні*, с. 164.

[6] *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы.* Т. 11: Р–С., укл. В. А. Авілава [і інш.], Мінск 2006, с. 214.

[7] *Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка*, укл. Т. В. Валодзіна, Мінск 2007, с. 209.

[8] Там же, с. 220–221.

[9] *Народная медыцына...*, с. 246.

ці сам ён зялёны[10]. На Гомельшчыне вераць, што *"ў прудах, азёрах, рэках жывуць вадзянікі. Гэта стары з зялёнымі валасамі, з барадою з водарасцей"*; "[вадзянік] *мае высокі рост, зялёныя вочы, рыбій хвост і доўгія валасы"*; "[русалкі] *імеюць длінныя зялёныя валасы і хвост, як у рыбы"*; *"З віду яны* [русалкі] *застаюцца прэжнімі, толькі валасы, кожа зеленаватыя. Ад таго, што у вадзе ўсё ўрэмя"*[11]. У вёсцы Ціхманьга апавядаюць пра русалак, якія сядзяць на камені і расчэсваюць свае валасы, зялёныя ці белыя з зялёным адценнем [ПА].

У шматлікіх песенных тэкстах, замовах, загадках семантычна важным выступае падкрэсліванне зялёнасці дрэва ці яго частак: *"Стоит Алёна, хустка зелёна, // Чорный стан, // Билый сарафан. – Бяроза"* [ПА; Бельск Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.]; *"Закаціся, сонейка, // За зялёнае дрэва"*[12]; *"Зялён явар, зялёны!"*[13]. У песнях і замовах "зялёны" – пастаянны эпітэт вінаграду, віна: *"...на тых на скацерсьцях тры кубкі зеляного віна"*[14]; *"Ой кому идти вина стерегти. // Свети вечер. // Наташки ити вина стерегти, // Стерегла вина дай уснула. // Свети вечер. // Поналетели яркие пташки, // Повипивали вино зелено..."* [ПА, Капачы Чарнобыльскага р-на Кіеўскай вобл.]. Пры гэтым пастаянны эпітэт *зялёны*, з'яўляючыся фонава-энцыклапедычна лішнім (як у вясельнай песні: *"У гародзе зялёная веточка зялёна..."*[15]), валодае стойкай пазітыўнай, жыццесцвярджальнай семантыкай і, верагодна, успрымаецца больш не як колер, а як стан раслін. Прыкладам гэтаму могуць быць словы балады: *"Пахавала сына ў зялёным садочку, // Маладу нявестку – ў балоце з краёчку"*[16]. Пазітыўнае асэнсаванне зялёнасці дрэў характэрна народным тлумачэнням сноў: *"Дрэва зялёнае – улюбісся; без лістоў – удаўцом будзеш. Тое ж: сум, журба"*; *"Лес зялёны – добра, сухі – ліха"*; *"Лісцё пажоўклае, старое – смутак; лісцё зялёнае, маладое – здароўе, радасць"*[17]. Укажам таксама на апазі-

---

[10] Е. Е. Левкиевская, В. В. Усачева, *Полесский водяной на общеславянском фоне*, [в:] *Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья*, Москва 1995, с. 168.

[11] *Народная міфалогія Гомельшчыны*, укл. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак, Мінск 2003, с. 53, 63.

[12] *Баларды*, укл. Л. М. Салавей, Т. А. Дубкова, Мінск 1977, с. 306.

[13] *Валачобныя песні*, скл. Г. А. Барташэвіч, Л. С. Салавей, В. І. Ялатаў, Мінск 1980, с. 81, 91.

[14] *Замовы*, укл. Г. А. Барташэвіч, Мінск 2000, с. 90.

[15] *Вяселле. Песні: у 6 кн.*, Кн. 5, склад. Л. А. Малаш, З. Я. Мажэйка, Мінск 1986, с. 218.

[16] *Балады*, с. 455.

[17] *Беларускі народны соннік*, укл. і прадм. У. Васілевіча, Мінск 1995, с. 18, 16.

цыю *"зялёны/сухі" (= "жывы/памерлы")*, а яшчэ на сувязь зелянення і гарэння ў песнях тыпу *"А ў бару, бару ель гарэла, // Божа мой! // Не так гарэла, як зелянела. // А там дзевачкі краскі збіралі..."*[18]. Дрэва, як указвалася вышэй, – прататыповы носьбіт прыкметавага канцэпту 'зялёны'. Жыхары вёскі Зялёнкі Мядзельскага раёна тлумачаць назву сваёй вёскі: *"Зялёнкі – зелені многа, тут скрозь клёны, слівы, уся дзярэўня пазаросла..."* [ФЭАБ]. Інфармацыйную перанасычанасць, якая назіраецца пры спалучэнні аб'екта і яго прыкметы ("дрэва" + "зялёны"), можна разглядаць як рэалізацыю прынцыпу ўзмацнення сэнсу. І дрэва, і "зялёнасць" паасобку могуць выяўляць тую самую семантыку жыцця, а таксама зменлівасці, пераходнасці, што звязана з сезоннай зменлівасцю вегетацыі. У сувязі з гэтым характэрна, што ў палескіх замовах (як і ў замовах іншых славянскіх традыцый) месцы, маркіраваныя зялёным колерам, успрымаюцца як межавыя, чужыя, далучаныя да іншасвету. У такія месцы высылаюцца хваробы (*"Высылаю, высяляю на зялёныя лугі..."*). Згадаем тут пра клён: *"Каб табе на зелле!"*[19]. У замовах *зялёнае* асэнсоўваецца як атрыбут прыроды і адкрытай прасторы, у якой валадарыць нячыстая сіла: *"Ехаў звіх па зялёнаму лугу..."*[20]. Таму такая прастора, паводле заўвагі Л. Радэнкавіча, уяўляе патэнцыяльную небяспеку для чалавека. У вузкім сэнсе зялёны колер звязаны з той часткай прасторы, куды выганяецца нячыстая сіла ці дзе адбываюцца нейкія міфічныя падзеі, якія выклікаюць змяненне стану рэчаў (аддзяленне нячыстай сілы ад чалавека)[21]. Прыкладам сказанаму можа быць замова "ад цімяннога зуба": *"цімяннэй зуб, ступай на зялёны дуб! На зялёным дубу, на дзівятым суку, там царыца Марэя і прысвятая Праскавея"*[22]. Эпітэт *зялёны* ў замовах вызначае месца, дзе знаходзяцца сакральныя памочнікі: Гасподзь, Хрыстос, Божая Маці, святыя ( *"Шоў Гасподзь па шырокай дарозі, па вялікіх лясах, па зялёных лугах"*[23]). У замове ад хлеўніка гаворыцца, што на сінім моры, на выспе *"зеляная ель, на той елі шаўковая плець, на той плеці залатое чарасло. На том чарасле Прэсвятая матар Божая*

---

[18] *Купальскія і пятроўскія песні*, укл. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч, Г. В. Таўлай, Мінск 1985, с. 307.

[19] *Выслоўі*, с. 212.

[20] *Замовы*, с. 166.

[21] Л. Раденкович, *Символика цвета в славянских заговорах*, [в:] *Славянский и балканский фольклор. Реконструкция древней славянской духовной культуры: источники и методы*, Москва 1989, с. 137–138.

[22] *Замовы*, с. 190.

[23] Там же, с. 176.

*стаяла, Суса Хрыста на руках дзяржала"*. Паводле логікі гэтай замовы, як трыдзевяці ідалам *"етага дрэва і не сеч, не рубаць, Хрыста ў вочы не відаць, так і варанога каня ня есць не няць"*[24].

Медыятыўнай семантыкай надзяляецца зялёны колер і ў заклічках тыпу *"Идэ, идэ, дождику, // Сварим тобэ боршчику, // Ўтп зэлэному горшчыку"* [ПА; Вышэвічы Радомышльскага р-на Жытомірскай вобл.]; *"Иды, иды, дошчыку, // Зварю тоби боршчыку // Ў зэлэному горшчыку. // Тобэ каша, мэнэ борщ, // Шоб густейши падал дощ"* [ПА; Олбін Казялецкага р-на Чарнігаўскай вобл.]. У такіх кантэкстах зялёны посуд звязаны з ідэяй ахвяравання. У сувязі з гэтым укажам на выкарыстанне посуду зялёнага колеру (як памежнага паміж "тым" і "гэтым" светам) у варожбах і магіі розных славянскіх традыцый: сербы ў медыцынскай магіі выкарыстоўваюць зялёную міску, а таксама тушаць у такой місцы вуголле і называюць імя чалавека, які сурочыў нямоглага; балгары ахвяруюць русалкам посуд зялёнага колеру за дапамогу пры пазбаўленні ад хваробы, атрыманай на Русальным тыдні[25].

Важную ролю адыгрывае зеляніна ў паваротныя моманты года, адзначаныя ў палескім (шырэй – славянскім) календары шэсцем пераапранутых, а таксама на пэўных этапах абрадаў жыццёвага цыкла. Пры яе дапамозе рэалізуецца апатрапейна-прадукавальная семантыка абрадаў. Зеляніна з'яўляецца асноўным атрыбутам галоўнага персанажа і ўдзельнікаў святочных шэсцяў, цэнтральным аб'ектам рытуалізаваных дзей на Юр'я, Вербніцу, Сёмуху, Івана Купалу, Спаса і інш. Зеляніна – найбольш устойлівы знак пераапранання "русалкі" ў палескай традыцыі[26]. Формы рытуальнага выкарыстання свежай зеляніны (травы, галін, кветак, лісцяў, букетаў) у вясенне-летніх каляндарных абрадах – гэта збор траў і нарыхтоўка раслін для рытуальных, магічных і лекавых мэтаў; біццё зялёнай галінай сямейнікаў і свойскай жывёлы як сродак супраць хвароб і для надання бадзёрасці; упрыгожанне зелянінай двароў і пабудоў; варожбы[27]. У сувязі са сказаным характэрны назвы траецка-сёмушных свят – *Зелянец, Зеліна ніділя* (параўн.: *"Зелена нидиля – це русалки гуляють. Хто умэр ў цей день*

---

[24] Там же, с. 44.

[25] О. В. Белова, *Зеленый цвет*, [в:] *Славянские древности. Этнолингвистический словарь: в 5 т.*, под общ. ред. Н. И. Толстого, Т. 2: Д–К, Москва 1999, с. 306.

[26] Л. Н. Виноградова, *Мифологический аспект полесской "русальной" традиции*, [в:] *Духовная культура Полесья на общеславянском фоне*, Москва 1986, с. 112.

[27] Л. Н. Виноградова, В. В. Усачева, *Зелень*, [в:] *Славянские древности. Этнолингвистический словарь: в 5 т.* Т. 2: Д–К, под общ. ред. Н.И. Толстого, Москва 1999, с. 309.

*или пэрэд Зилинаю, тот и русалка”* [ПА; Олбін Казялецкага р-на Чарнігаўскай вобл.]). У гэты перыяд зеляніна адыгрывае асабліва значную ролю: *“Опуцки* [татарнік] *таке ставляют на окне. Липу и полинь. Щи ў дворе, шоб русалки гойдалися. Усю хату таку зелену зробляють”* [ПА; Вышэвічы Радомышльскага р-на Житомірскай вобл.]. У народным календары розных славянскіх традыцый *“Зялёныя дні”* адпавядаюць таксама Перадвелікоднаму тыдню.

У рытуальна-магічнай практыцы розных славянскіх традыцый зеляніна выкарыстоўваецца як сродак, які нейтралізуе, адганяе зло (хваробы, сурокі, нячыстую сілу, стыхійныя бедствы, дзікіх звяроў, шкоднікаў), валодае вітальнай, прадукавальнай сілай і надзяляецца медыятыўнай функцыянальнасцю. Адсюль зразумелая прысутнасць зеляніны на вяселлі (матэрыял для вянкоў, упрыгожання вясельнікаў, каравая, вясельнага дрэўца, памяшкання): *“Кажут, на вэнок пошлі хлопцы, дэўчата. Сповают ўсю ноч. Квэточкі плетут тые, некі ленточкі тако банціком, туды зэлёнэнькогo вазоніка, шо ростэ, такі колюшчэвэнькі. Тако цэлэ сітэчко наробят. А вжэ як прыедэ жэніх, усім ужэ прычэпвают гэты квэточкі”* [ФЭАБ; Хутко М. В. 1939 г.н., Дзягелец Бярозаўскага р-на]. Ніна Андрэеўна Каліноўская з в. Стайкі Івацэвіцкага р-на апавядае: *“Госці на вяселлі дараць пасуду, падушкі, рушнікі. На падушках, рушніках зялёны, красны, чорны цвета – спаконна беларускія цвета”* [ФЭАБ]. Зялёным колерам маркіраваны шматлікія рэаліі, прадстаўленыя ў вясельных песнях, да прыкладу: *“...Ой винку-винку. Зэлэный барвинку, // Наробыв мэни жалю, // Я чэрэз тэбэ, зэлэного, // Матичку спокыдаю”* [ПА; Забужжа Любомльскага р-на Валынскай вобл.]; *“Наехало бояроў да семьдесят // На мово татка двор. // Познай, познай, молода Параска, which котрий твой. // У синему да ў зеленому // Диверь мой...”* [ПА; Выступавічы Аўручскага р-на Житомірскай вобл.]. У шматлікіх вясельных песнях зялёныя расліны ці іх часткі складаюць прыродную паралель вобразам маладых: *“Горошок по дорозі котывся, // Зэлёный по дорозі котывся. // Йіванко до дівкі радывся, // Молодэй до дівкі радывся”*[28]; *“А сосна лэто и зиму зэлэна! // А ў патницу була дийчина вэсэла, // А ў субботу русую косу чэсала...”* [ПА; Вышэвічы Радомышльскага р-на Житомірскай вобл.]; *“Ой, спасыбо тоби, матэнька, // За зэлэну руту-мятоньку, // За чэрвоную колыночку, // За хорошую дэтыночку”* [ПА; Олбін Казялецкага р-на Чарнігаўскай вобл.].

[28] *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т.* Т. 4. *Брэсцкае Палессе: у 2 кн.* Кн. 1, Мінск 2008, А. М. Боганева [і інш.], с. 304.

У разнастайных варожбах вызначальнымі прыкметамі (асэнсаванымі як станоўчы прагноз) лічыліся: своечасовае з'яўленне лістоты на загадзя зрэзаных і пастаўленых у ваду галінах; роўнае сплаўленне пучкоў зяляніны і вянкоў па вадзе; захаванасць свежасці раслін[29]. Зялёны колер засохлых галін мае станоўчую ацэнку ў траецка-сёмушных гаспадарчых варожбах. Так, на Сёмуху ламаюць у лесе клён і па колеру яго лісцяў мяркуюць пра сена: калі клён засохне зялёным, сена будзе добрае, зялёнае, калі клён чырвоны, то год чакаецца мокры [ПА; Залатуха Калінкавічскага р-на Гомельскай вобл.].

Зялёнае (як маладое, растучае, няспелае) утварае апазіцыю з жоўтым (як старым, пераспелым) у прадпісаннях гаспадарчага характару, звязаных з народнымі ўяўленнямі пра месяцавы час: *"Як настане молодік, на треті день відно серпік. Треба гуркі сеять, штоб молодые былі, рослі добрые, зелёные, а не жолтые"*; *"На молодік траву сеять – шоб была зелена"*[30]. Неабходна звярнуць увагу на наступныя абставіны. Члены апазіцыі *"зялёны/сухі"* часта накладваюцца на апазіцыі *"жыццё/смерць"*, *"маладосць/старасць"* (з зялёным колерам звязана перш за ўсё сема 'малады', якая трансфармуецца ў семы 'няспелы', 'маленькі')[31]. Сказанае добра ілюструе запіс з Ляплёўкі Брэсцкага р-на. Інфармант апавядае пра сваю сястру, якая пражыла *палову века* (сорак два гады): перад смерцю сястра пабачыла ў сне, што яна праходзіць палову *зялёнага* саду і трапляе ў сухі сад. Са шчаслівым жыццём асацыюецца зялёны колер і ў варожбах тыпу *"У ныділю на Троіцу дівчаты шлы развываты бырозкы, ныслы до рыкы выночкы, пускалы іх на воду. Чый вынок був зылёны і плыв – тому повызэ на цілы год, чый засох, чы потонув – тому быда"* [ФЭАБ; Галаўчук Н. А. 1938 г.н., Снітава Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.]. У сёмушнай песні спяваецца: *"Дівчаты на Троіцу вынкы вылы, // Ай на Купала довывалы, // Про свою долічку гадалы. // Колы ж ты доля шчаслывая, // Цвыты, выночок, як васылёчок, // Колы ж ты доля нышчасна, // Ссохны выночок, як сухорочок"* [ФЭАБ; Галаўчук Н. А. 1938 г.н., Снітава Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.].

---

[29] Л. Н. Виноградова, В. В. Усачева, *Зелень*, с. 310.

[30] О. В. Чёха, *Языковой и культурный образ лунного времени в полесской традиции*, [в:] *Славянский и балканский фольклор. Семантика и прагматика текста*, Москва 2006, с. 496.

[31] Т. И. Вендина, *Семантико-символическая парадигма цвета в контексте словообразования*, [в:] *Etnolingwistyka*, № 12, Lublin 2000, s. 200.

Аднак, вядомы і зусім іншыя кантэксты, у якіх і зялёныя, і сухія расліны (салома) асацыююцца са смерцю, з нябожчыкамі. Зялёная галіна ўвасабляе памерлага сваяка ці выступае змяшчальняй яго душы. Яшчэ У. Проп, выкарыстоўваючы назіранні А. Зярновай і іншых этнографаў, слушна сцвярджаў, што ў абрадах Сёмухі і Тройцы прасочваецца ўяўленне, што памерлы ўваскрасае ў расліннасці і што бярозка, якая завівалася, нейкім чынам асацыявалася з памерлым чалавекам, разглядалася як яго новае ўвасабленне. Далей У. Проп, спасылаючыся на А. Б. Зернову, піша, што ў вёсцы ўсе хаты прыбіраюць яшчэ з вечара галінамі бярозы, ці імі ж упрыгожваюць пярэдні вугал хаты. Паводле веравання, пашыранага ў дадзенай мясцовасці, у гэтыя галіны ўсяляюцца душы памерлых сваякоў. Што душы ўсяляюцца ў галіны, гэта, на думку У. Пропа, больш позняе прыўнясенне пад уздзеяннем хрысціянскага веравучэння пра бесцялесныя душы, якія лунаюць недзе ў прасторы. Зыходнае ж уяўленне заключаецца ў тым, што зялёная галіна ёсць некаторае ўвасабленне памерлага. Гэтым галінам прыпісваецца магічная сіла. Галіны не выкідваюцца і пасля свята, а ўтыкаюцца над варотамі ў двары для аховы свойскай жывёлы ці кладуцца ў засек для аховы ад мышэй. Для гэтага ж яны потым кладуцца пад снапы хлеба, пад сена[32]. Супаставіўшы названае сведчанне, а яшчэ абрадавае ўжыванне ў ежу яек пад траецкай бярозкай, з абрадамі, якія здзяйсняліся на могілках, куды таксама прыносілі напоі, яйкі і дзе іх пакідалі ці крышылі на зямлю, У. Проп прыйшоў да важнай высновы пра тое, што паміж культам памерлых і культам раслін маецца генетычная і сэнсавая сувязь[33]. Прычым сухая і зялёная расліннасць у сімвалічных кантэкстах можа быць прадстаўлена адначасова. У гэтым ракурсе характэрны элементы палескай купальскай абраднасці, дзе саламянае пудзіла саджалі на зялёнае дрэва або падпальвалі салому, замацаваную на галінах няссечаных дрэў[34]. У такіх выпадках звычайна зялёнае дрэва функцыянуе як медыятар – адпраўшчык на *той* свет душ памерлых, міфалагічных істот.

У пахавальна-памінальных абрадах *зялёны* з'яўляецца колерам *таго* свету. Яйкі гэтага колеру вядомы як памінальная ежа ва ўсходніх славян і балгар. У Палессі на Вялікдзень фарбавалі яйкі ў зялёны колер, калі на працягу года памёр хтосьці з сямейнікаў: *"Як хто умер,*

[32] В. Я. Пропп, *Русские аграрные праздники*, Ленинград 1963, с. 113.

[33] Там же, с. 114.

[34] В. Камінський, *Свято Купало на Волинскому Поліссі*, [в:] *Етнографічний вісник*, кн. 5, Київ 1927, с. 12.

*а год ешчо не вышэў, да нарвуть сена, або жыта и красять зелёные яйца”* [ПА; Радчыцк Столінскага р-на Брэсцкай вобл.]. Калі на Вялікдзень яйкі фарбавалі ў чырвоны колер, то на Радуніцу – у зялёны [ФЭАБ; Ефімовіч В. І. 1941 г.н., Дрэбск Лунінецкага р-на]. У пахавальным абрадзе зялёны колер можа быць прадстаўлены разам з чорным: *“...Шылы гэтак, як і всэ. Зарэ – крыжа чорного до наволочкы (в туй подусыццы). А колысь ны прышывалы. Чырвоный вжэ не... Колысь – на рогах (в наволоцы) квыточкы, з нытoк зробыть квітку, зылёный цвіт, з бавэлу (ныткы крашаны) помотае бы накрыж, бы крыжыка зробыть на тых двох уголках”*[35]. У сувязі са сказаным згадаем балгарскую легенду пра вінаватых перад Богам св. Дзмітрыя і св. Міхала, якія перад тым, як адправіцца ў месца пакарання (на дно мора), апрануліся ў зялёнае і чорнае адзенне[36]. У Гродзенскім Панямонні зялёны тканы пояс вешалі на надмагільны крыж. Рэаліі зялёнага колеру згадваюцца і ў народных тлумачэннях сноў, якія вяшчуюць смерць: *“Ешы, кажут, колі прысніцца пер’е цыбулі зэлёнэнькэ, а у ім много, много чэрвячкоў, то гэто до скоропосціжной смэрці”* [ФЭАБ; Хутко М. В. 1939 г.н., Дзягелец Бярозаўскага р-на] (у дадзеным выпадку важная таксама семіятызацыя чарвякоў як істот, звязаных з хтанічным светам, смерцю). Смерць варожыць і сон, у якім чалавек рве зялёныя грушы [ПА; Верхнія Жары Брагінскага р-на Гомельскай вобл.]. Разам з тым лічылася, што бачыць у сне зялёнае жыта – вельмі добра [ПА; Капачы Чарнобыльскага р-на Кіеўскай вобл.].

У паэтычных творах *зялёнае* можа асацыявацца з багаццем, прыгажосцю, высокім сацыяльным статусам (*“...Дасць табе пан варанога каня, // Святы вечар добрым людзям. // А царэўначка – зялёны жупан, // Святы вечар добрым людзям. // Будзе Ванечка маладзенькі пан...”*[37]), а таксама з жыццёвай энергіяй, весялосцю (*“– Ды чаму ж ты, ялiначка, // Не зялёна, // Не зялёна? // – Ды як жа мне, ялiначцы, // Зялёнай быць, // Зялёнай быць? // Пада мной два купчыкі // Начавалі, // Начавалі, // Яны ж маё карэнейка // Вытапталі... // Ды чаму ж ты, дзяўчыначка, // Не вясёла, // Не вясёла? // – Ды як жа мне, малодзенькай, // Вясёлай быць, // Вясёлай быць? // Калі*

[35] Ф. Д. Климчук, *Духовная культура полесского села Симоновичи*, [в:] *Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья*, Москва 1995, с. 345.

[36] О. В. Белова, *Зеленый цвет*, с. 306.

[37] *Вечнае: Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна*, аўт.-уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак, с Гомель 2003, с. 77.

*ў мяне два малойцы начавалі, // Начавалі, // Яны ж мае падушачкі // Вытаўкалі...”*[38]). Нагадаем таксама традыцыйныя асацыяцыі зеляніны з раем, прыгажосцю, гармоніяй, як у аповедзе пра траецка-сёмушныя святкаванні: *“Рвалі яер. Сыпалі чы клалі ў хату, клалі во двор этэ лісце, галінкі запіхалі за балькі. Войдэш у хату – то быв рай! Бы в саду прамо. Хорошэ-хорошэ!”*[39].

Трэба адзначыць таксама, што зялёны колер з’яўляецца кампанентам шэрагу сучасных фразеалагізмаў – да прыкладу, *зялёная вуліца*, які стаў гістарызмам і ўжываецца са значэннем ‘строй салдат са шпіцрутэнамі’ толькі ў тэкстах і вуснай мове, калі гаворка ідзе пра з’явы мінулага. У царскай Расіі было такое пакаранне: абвінавачанага праводзілі праз строй салдат, кожны з якіх павінен быў выцяць асуджанага па голай спіне шпіцрутэнам – двухметровай гнуткай палкай. Праход паміж дзвюма шарэнгамі ўяўляўся як “вуліца”, а “зялёнай” яна называлася таму, што ў руках салдат былі звычайна зялёныя, з лазняку, пруты. Гэты фразеалагізм мае і другое значэнне – ‘свабодны шлях, без перашкод і затрымак’. Паходзіць з прафесійнай мовы чыгуначнікаў: калі трэба тэрмінова даставіць па чыгунцы важны груз, то цягніку на працягу ўсяго яго руху адкрываюць зялёныя семафоры[40].

У хрысціянстве зялёны колер, у адрозненне ад трансцэндэнтнага сіняга, асэнсоўваўся як больш “зямны” і абазначаў жыццё, адраджэнне, вясну, маладосць. У візантыйскім мастацтве – аддзяляў боскае (ці царскае) ад зямнога[41]. Часам гэты колер надзяляўся негатыўнай семантыкай, абазначаў спакушэнне, каварства, а сатана ўяўляўся з зялёнымі вачыма (згадаем сучаснае: *“У бяды вочы зялёныя”*, *“Туга зялёная”*). У беларускіх замовах сярод “дрэнных” вачэй называюцца зялёныя: *“На сінім моры белы камянь, з-пад белага камня выйшлі тры дзявіцы, тры сястрыцы, яны разнасілі ўрокі-прарокі, шэры глаз, зялёны глаз, чорны глаз”*[42]. Негатыўная ацэнка зялёнага адлюстравана ў вераванні, занатаваным намі ў в. Амельянец Камянецкага р-на, што каравайніца не павінна быць з зялёнымі вачыма.

38 *Веснавыя песні*, с. 311–312.

39 *Традыцыйная мастацкая культура...*, с. 135.

40 І. Я. Лепешаў, *Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў*, Мінск 2004, с. 172.

41 Л. Раденкович, *Символика цвета в славянских заговорахб*, [в:] *Славянский и балканский фольклор. Реконструкция древней славянской духовной культуры: источники и методы*, Москва, с. 137.

42 *Замовы*, с. 267.

* * *

Такім чынам, утрымліваючы дзве процілеглыя тэндэнцыі – жыцця і смерці, – зялёны колер функцыянуе як амбівалентны сімвал. Як галоўны тон лета *зялёны* – гэта колер поўнай жыццёвых сіл расліннасці, прыроды ў яе зменлівасці, няспеласці, маладосці, які выяўляе актыўнасць, стварэнне, жыццястойкасць, сімвалічна звязваецца з ідэяй пераходнасці. З іншага боку, зялёны колер асацыюецца з пасіўнасцю, нерухомасцю, і таму судачыняецца са сферай смерці, сімвалізуе безжыццёвасць, той свет і яго прадстаўнікоў, а таксама вечнасць. Гэтыя факты цалкам вызначаюць багацце міфа-абрадавых кантэкстаў прадстаўленасці зялёнага колеру ў традыцыйнай культуры Палесся.

Новыя матэрыялы па традыцыйнай духоўнай культуры Палесся, якія асабліва інтэнсіўна ўводзяцца ў навуковы ўжытак у апошнія тры дзесяцігоддзі, дазваляюць вырашыць важныя пытанні, звязаныя з вызначэннем спецыфікі семіятычнай арганізацыі свету старажытным мысленнем, раскрыццём механізмаў трансляцыі зместу славянскай традыцыйнай культуры праз розныя коды, рэканструкцыяй яе сцёртых фрагметаў, глыбінных і складаных сэнсаў. Ёсць спадзяванне, што гэта, у сваю чаргу, паспрыяе актуалізацыі магутнага маральна-этычнага, эстэтычнага патэнцыялу традыцыйнай духоўнай культуры.

## MYTHOLOGICAL SEMANTICS OF THE GREEN COLOUR IN THE TRADITIONAL SPIRITUAL CULTURE OF THE POLES’E

S U M M A R Y

The article is devoted to the semantics and functioning of the green colour in the mythology and folklore of the Poles’e in the Slavonic context. Sign “green” marks mythological space and time. This colour is associated with mutability, unripe, youth and symbolizes fertility, development, vitality, transition. Green colour reproduces an idea about passiveness, property, death, “strange” and the other world.